# КРЫЖАВАНКА «МАКСІМ БАГДАНОВІЧ»








**Па гарызанталі:**

1. Прозвішча скульптара, аўтара помніка Максіма Багдановічу ў Мінску.
2. Хросная маці Максіма Багдановіча, якая выпісала яму беларускія газеты.
3. Назва першай і адзінай кнігі вершаў Максіма Багдановіча, выдадзенай пры жыцці паэта.
4. Назва першага твора Максіма Багдановіча, які быў надрукаваны ў газеце «Наша ніва» ў 1907 г.
5. Аўтар аповесці-эсэ «Загадка Багдановіча» (1969).
6. Слова, прапушчанае ў назве і першым радку верша «<...> вечар, ціхі вецер, свежы стог...».
7. Рэдактар вершаў Багдановіча; даў назву першаму зборніку паэта, знайшоў малюнак для вокладкі.
8. Слова ў назве артыкула «Забыты <...>» (1915).
9. Прозвішча кампазітара, які напісаў песню «Вераніка» на словы М. Багдановіча.
10. «Малюнкі і <...>» — слова ў назве першай часткі зборніка «Вянок».
11. Імя дзяўчыны, якая была музай паэта і якой Максім Багдановіч прысвяціў паэтычны цыкл «Мадонны», а таксама, як мяркуюць, «Рамане» («Зорка Венера ўзышла над зямлёю...»).
12. Прозвішча выдаўца кнігі М. Багдановіча «Вянок».

**Па вертыкалі:**

Мясціна, дзе летам 1911 года гасцяваў паэт і якая стала крыніцай яго натхнення.

**Адказы**

*Па гарызанталі:* 1 — Вакар; 2 — Сёмава; 3 — «Вянок»; 4 — «Музыка»; 5 — Стральцоў; 6 — цёплы; 7 — Ластоўскі; 8 — шлях; 9 — Лучанок; 10 — спевы; 11 — Ганна; 12 — Кухта.

*Па вертыкалі:* Ракуцёўшчына.

***Склала В. У. Палаўко,***
*выкладчыца УА «Пінскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж імя А. Я. Кляшчова».*